прыйшоў да яўна мяцежнага вываду аб тым, што «рацыянальная тэалогія» як тэарэтычная навука немагчыма і як такая не мае права на існаванне. Калі ўлічыць, што ў Полацкай езуіцкай акадэміі функцыянаваў тэалагічны факультэт, то падобныя меркаванні Канта мелі, несумненна, злабадзённы характар, і менавіта таму яны выклікалі такую негатыўную рэакцыю каталіцкіх артадоксаў.

У пачатку 20-х гадоў XIX ст. у Беларусі і Літве пачалося знаёмства з філасофіяй Шэлінга. Вяшчальнікам ідэй філасофскага рамантызму выступіў Ю. Галухоўскі (1797 — 1858), фундаментальна адукаваны філосаф, вучань і прыяцель Шэлінга. Вядомасць яму прынёс прысвечаны Шэлінгу і выдадзены ў 1822 г. у Эрлангене на нямецкай мове твор «Філасофія і яе адносіны да жыцця цэлых народаў і асобных людзей» (у 1834 г. перакладзены Д. М. Вяланскім на рускую мову). Гэтая праца і паслужыла падставай для запрашэння Ю. Галухоўскага на кафедру філасофіі ў Віленскі універсітэт, дзе яго выкладчыцкая дзейнасць працягвалася вельмі недоўгачасна (з восені 1823 па люты 1824 г.). Сутнасць яго лекцый, што карысталіся незвычайнай папулярнасцю ў слухачоў, у тым, што філасофія заклікала дапамагчы людзям у разуменні свету як гарманічнай боскай цэласнасці, у пошуках сувязей з творчымі сіламі прыроды і пераадолення такім чынам сацыяльнага атамізму. Кожны народ павінен мець сваю нацыянальную філасофію, а сапраўдны філосаф з'яўляецца органам народнай самасвядомасці, што мае права ў сваім імкненні да ісціны не лічыцца з застыўшымі традыцыямі і меркаваннем большасці. Індывіду філасофія павінна даць «цэласны погляд на свет», пачуццё адзінства з народам і сусветам, без чаго немагчыма станаўленне асобы. Нягледзячы на сваю папулярнасць, а, можа, і насуперак ёй, Галухоўскі пасля завяршэння судовага працэсу над філаматамі разам з іншымі папулярнымі прафесарамі (Бабpоўскім, Данілевічам, Лелевелем) быў пазбаўлены кафедры нібыта на падставе «дрэннага ўплыву на моладзь».

Закрыццё самадзяржаўем галоўных навуковых цэнтраў крытыкі Канта «злева» і «справа» (Віленскага універсітэта ў 1832 і Полацкай езуіцкай акадэміі ў 1820), з аднаго боку, выкладчыцкая дзейнасць Ю. Галухоўскага, з другога, садзейнічалі змяншэнню ў Беларусі цікавасці да філасофіі Канта і абуджэнню павышанай увагі спачатку да ідэй Шэлінга, а потым (у 30 — 40-я гг. XIX ст.) — Гегеля. Такім чынам, пік навуковага ўспрыняцця філасофіі Канта на Беларусі прыпадае на першую трэць XIX ст. Палеміка, што вялася вакол філасофіі Канта ў гэты час, садзейнічала развіццю філасофскай думкі Беларусі, умацаванню ліберальнага напрамку грамадскай думкі, аслабленню ўплыву тэалогіі. Гэтая незаслужана забытая старонка нацыянальнай гісторыі філасофіі, несумненна, патрабуе пільнай увагі даследчыкаў.

[1] Галоўныя ідэі трактата І. Канта «Да вечнага міру» аўтарам гэтага артыкула выкладаліся на Усесаюзнай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 250-годдзю І. Канта (Калінінград, красавік 1974). Надрукаваны ў дадатку да зборніка «Вопросы теоретического наследия Иммануила Канта» (Калінінград, 1977, с. 132 — 137) — рэфератыўны пераказ Д. І. Грышына.

[2] Śniadecki J. Dzieła. Warszawa, 1840. T. 3. S. 269.

[3] Избранные произведения прогрессивных польских мыслителей. М., 1956. Т. 1. С. 631.

[4] Гл.: Дорошевич Э. К. Философия эпохи Просвещения в Белоруссии. Мн., 1971. С. 80 і далей.

[5] Там жа. С. 87.

[6] Гл.: Historia Nauki Polskiej. Wrocław; Warszawa etc., 1977. T. 3. S. 361.

[7] Гл.: Abicht I. H. Initia philosophiae proprie sic dictae. Vilnae, 1814. P. 11.

[8] Kant I. O pedagogice. Wilno, 1819. S. VII, VI.

[9] Гл.: Дорошевич Э. К. Аниол Довгирд — мыслитель эпохи Просвещения. Мн., 1967. С. 173 — 174.

Т. І. ГЛУШАКОВА

## КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ АБРАЗАПІСАННЯ (XI — XVI стст.)

Культурная з'ява, што ўвайшла ў навуковы ўжытак пад назвай «беларускі абраз» — яскравае сведчанне творчых намаганняў і адкрыццяў нашых шматлікіх продкаў, але і ў роўнай меры — адкрыццё сучасных беларускіх даследчыкаў, «доўгачаканая нечаканасць»[1], якая мусіць узнавіць духоўныя каштоўнасці.

Не заглыбляючыся ў пытанне пачатку гісторыі абразапісання, трэба адзначыць, што гэтая галіна традыцыйнага мастацтва на беларускіх землях пачала развівацца гэтаксама, як і ў шмат іншых хрысціянскіх краінах, маючы ў якасці падмурку добравядомы і распаўсюджаны візантыйскі стыль. Магутная духоўная візантыйская традыцыя, найбольш характэрнымі рысамі якой сталі дыдактыч-

насць, спірытуалізм, праграмнасць, сімвалічнасць і адухоўленасць, прысутнічала ў нашым рэгіёне не толькі ў выглядзе мастацкага імпарту (як, напрыклад, багародзічны абраз, што быў прысланы канстанцінопальскім імператарам у адказ на просьбу Ефрасінні Полацкай), але і ўвасобленая ў сакральных творах мясцовых майстроў, якія ў даволі сціслы прамежак часу выйшлі на этап самастойнага пераасэнсавання ўсходніх мастацкіх узораў. Дастаткова падстаў дзеля падобных меркаванняў дае ўжо XIV ст., калі на беларуска-украінскіх землях распачынаюцца працэсы «не сляпога капіравання пэўных візантыйскіх узораў, а, хутчэй, іх радыкальнай перапрацоўкі, якая сведчыла аб зусім іншым разуменні, чым гэта ўласціва было грэчаскім майстрам»[2].

З сярэдзіны XV ст., калі захоп туркамі Канстанцінопаля кладзе канец існаванню Візантыйскай імперыі, лёс візантыйскай духоўнай традыцыі вырашаецца на чужых тэрыторыях. Шляхі развіцця гэтага поствізантыйскага мастацтва былі разнастайнымі, на беларускіх жа землях яны набываюць своеасаблівы характар. На нашу думку, немагчыма пагадзіцца з высновай, што ў XVI ст. «быў паложаны пачатак паступовай *нейтралізацыі* візантыйскай традыцыі. Тым самым як бы пастаўлена на выпрабаванне яе жыццяздольнасць»[3].

Падставы для немагчымасці безумоўнага прыняцця тэрміну «нейтралізацыя» даюць наступныя разважанні. На Беларусі, найперш, з прычыны яе геапалітычнага і культурнага становішча, традыцыйна існавала шырокая магчымасць пранікнення розных мастацкіх стыляў, у прыватнасці, твораў рэлігійнага мастацтва з каталіцкага Захаду. Частка мясцовых жыхароў, а з XIV ст. яна становіцца даволі значнай, належала да каталіцкай канфесіі, і можна меркаваць, што густы гэтай праслойкі тагачаснага грамадства задавальняліся ўзорамі заходняга мастацтва. Значным у шэрагу названых акалічнасцей падаецца і той момант, што для Беларусі гэтых часоў быў характэрны менавіта такі тып праваслаў'я, які не меў моцнага адцення непрыхільнасці ці непрыязнасці да Рыму і да каталіцызму ўвогуле. З узмацненнем сувязей з заходнееўрапейскай цывілізацыяй у XVI ст. узоры новых стыляў, з прынцыпова іншымі, чым у візантыйскім абразе, рысамі і спосабамі выяўлення гэтых рысаў, становяцца вельмі пашыранымі. Нашы продкі знаёмяцца з той манерай выканання абраза, дзе на першае месца выходзіць пачуццёвае, а часамі нават і натуралістычнае, матэрыяльнае. Такім прыкладам можа служыць алтарная карціна «Пакланенне вешчуноў» (1514 г.), выкананая ў стылі Паўночнага Адраджэння. Лірычны, амаль інтымны настрой, мяккая жывапісная манера, адметнай рысай якой з'яўляецца свежы, натуральны каларыт, цікавасць да партрэтнай распрацоўкі вобразаў, паказвае, якога роду мастацкі імпарт уплываў на складванне стылю мясцовага рэлігійнага жывапісу.

Далейшае развіццё айчыннага абразапісання нельга, на наш погляд, разглядаць як «нейтралізацыю» візантыйскага стылю — гэта была эпоха сінтэзу, вельмі своеасаблівага спалучэння, сплаву візантыйскай духоўнай традыцыі з традыцыямі каталіцкага заходнееўрапейскага мастацтва. Менавіта ў рэчышчы такога сінтэзу, у пошуках разумнага кампрамісу і пачаў зараджацца феномен беларускага нацыянальнага іканапісу, беларускага абраза. Найбольш выразна тэндэнцыі складвання гэтага феномена можна прасачыць на прыкладах багародзічных ікон. У XV — XVI стст. ва ўсёй усходняй Еўропе атрымліваюць шырокае распаўсюджанне спіскі ікон Багамаці Адзігітрыі. Шырацца яны і на Беларусі. Тыя новыя з'явы, што пазней, у XVI — XVII стст., становяцца найбольш характэрнымі рысамі беларускага абраза, можна выразна прасачыць на прыкладзе абраза Багамаці Адзігітрыі са Слуцкага раёна. Майстар простасардэчна і старанна паўтарае візантыйскі ўзор; несуразмернасць фігур на іконе гаворыць, што ён не заўсёды ўмее рабіць так, як патрабуюць правілы гэтага ўзору, але вельмі выразна відаць, як прагне ён выказаць свае пошукі душэўнай праўды. Візантыйскія абразы заўсёды выконваліся ў гэткай меры ідэальнасці ў сваёй адлучанасці, што свет чалавечых перажыванняў не мог, здаецца, сутыкнуцца з іх высокай духоўнасцю. Гэтыя абразы найчасцей прызначаны былі адцягнуць чалавечую душу ад зямных захапленняў, перавесці іх у іншы план, прыблізіць да спакою сузірання. Згаданая ж ікона Случчыны захапляе сваёй лірычнасцю, прывабнасцю, душэўнай раскрытасцю, прыналежнасцю свету зямных пачуццяў.

У межах працэсаў фарміравання беларускага абраза адбываўся не проста сінтэз розных стыляў з аб'яднаннем у новую форму і змест выпадковых ці неістотных рысаў «чужога» мастацтва. Гэта быў складаны працэс адбору менавіта лепшых стылёвых прыкмет і бакоў, гэтак жа, як і запазычванне толькі тых ідэй іканапісу, што найболей адпавядалі ментальным структурам хрысціянскіх народаў, якія жылі ў межах этнічнай Беларусі. Больш падрабязней спынімся на зносінах з візантыйска-праваслаўнай традыцыяй. Галоўнае, што імпанавала, вабіла ў візантыйскай канцэпцыі іконы — гэта яе надзвычай высокая адухоўленасць. Але, як нам падаецца, у візантыйскім абразе было нешта і такое,

што малады растучы беларускі этнас цалкам прыняць не мог. У вельмі вызваленых тыпах гэтых ікон погляд звернуты ў глыбіню, а не накіроўваецца ў свет; як мы ўжо прыгадвалі, ён абыякавы да сферы зямных учынкаў, перажыванняў. Усё гэта вельмі добра суадносілася з культурнай атмасферай рафінаванага, пагружанага ў класічныя заняткі Канстанцінопаля, але як далёка гэта было продкам нашай зямлі, якая актыўна шукала свой асабісты гістарычны і, што асабліва важна, свой непаўторны духоўны шлях. Важна заўважыць і наступнае. Візантыйскі абраз «у сваёй сутнасці ёсць найбольш поўная адпаведнасць візантыйскай рэлігійнай ідэі... найбольш чыстае ўвасабленне візантыйскай канцэпцыі іконы»[4]. Праваслаўная рэлігійная ідэя ў рамках Візантыі атрымала сваё найлепшае і прадуктыўнае ўвасабленне ў містыка-філасофскай тэорыі ісіхазма (Грыгорый Палама, Грыгорый Сінаіт, Мікалай Квасіла). Бог як сутнасць абсалютна недаступны пазнанню, таму перад першарэчамі філасофія апынаецца ў стане апорыі (ад слова «Порос» — «проход» з адмоўным «а»). Гаворачы ўмоўна, да Вышэйшага няма ні маста, ні парома. Рэлігія, у адрозненне ад філасофіі, ведае аб непрыступнасці Боства, але ўсё ж спрабуе ўступіць з ім у сувязь тымі асобымі шляхамі, якія адкрыты толькі ёй, вобразна кажучы, наладзіць масты (адсюль і сёння «панціфекс» — будаўнік мастоў — першасвятар Рымскай царквы). Аб сваіх асаблівых шляхах сувязей з Богам і вучылі ісіхасты. Бог праяўляе сябе ў сваіх энергіях, да якіх можна дакрануцца адзіным шляхам — сузіраннем. Тэорыя рэлігійнага «звароту да самаго сябе», як нам здаецца, аказала наймацнейшы ўплыў на складванне канцэпцыі візантыйскага абраза. Нейтральны, нерухомы, маўклівы — такі тып абраза пры павольным углядванні ў яго даваў чалавеку добрую магчымасць выслабаніцца ад эмоцый, ад якога б то ні было асабістага ўспрымання, і стаць здольным да разумення боскага прататыпу. Зразумела, што гэты тып абразоў, найперш, мог узнікнуць у манастырах, у пустэльніцтве, у свеце практычна і духоўна адлучаным ад мітусні жыцця, але распаўсюджанне ісіхасцкага напрамку ў візантыйскай рэлігійнай свядомасці паслужыла актыўнаму падтрыманню той іканаграфічнай традыцыі, якую мы умоўна называем «духоўнай сузіральнасцю».

Такім чынам, усходняя ікона стала свайго роду сродкам рэалізацыі праваслаўна-аскетычнага падыходу да «духовного делания». Для Беларусі, што першапачаткова прымае хрысціянства ў яго ўсходнім варыянце, нягледзячы на гэтыя абставіны, быў характэрны свой шлях духоўнага развіцця. Адметнасць яго вызначалася наступнымі акалічнасцямі. Па-першае, народы Беларусі ўспрынялі не толькі візантыйскую, але, як і іншыя славянскія народы, старажытнабалгарскую духоўную спадчыну. Па-другое, гэтая спадчына амаль адразу, праз невялікі гістарычны адрэзак, была дапоўнена і ўплывам каталіцкай духоўнай культуры. Па-трэцяе, усе пласты гэтай спадчыны аказаліся накладзенымі на такі магутны пласт асабіста славянскай і балцкай *язычніцкай* культуры, што на беларускай глебе ўсе гэтыя духоўныя ўклады моцна трансфармаваліся. І гэта мела вызначальны характар. Бо працэсы хрысціянізацыі беларускай зямлі адбываліся паступова, пераход насельніцтва са стану паганства ў лагер свядомых хрысціян адбываўся не гвалтоўным шляхам, а як вынік карпатлівай місіянерскай працы. Больш таго, асобныя балцкія групы насельніцтва прытрымліваліся паганскага веравызнання аж да XIV ст. Менавіта гэтая праслойка старажытнабеларускага грамадства была ахрышчана ў перыяд другой «рэлігійнай хвалі», якая ішла цяпер ужо не з Візантыі ці Балгарыі, а з каталіцкага Захаду і склала даволі шматлікую групу беларускіх каталікоў. Гэтыя чыста гістарычныя абставіны зусім іншым чынам уздзейнічалі на складванне адметнага *духоўнага* шляху беларускага этнасу. Доўгачасовае мірнае суіснаванне на нашай зямлі хрысціянства з паганскім светапоглядам выпрацоўвала ў тагачасным грамадстве незвычайную цярпімасць да пераканаццяў і рэлігійных схільнасцей акаляючых асоб, парадзіла феномен талерантнасці, аналагаў якой наўрад ці можна знайсці ва ўсім еўрапейскім свеце. У аснову нашага адметнага тыпу духоўнасці цалкам ляглі рэлігійныя ідэі. І хоць гэтыя ідэі ў аснове сваёй нічым не адрозніваліся ад тых ідэй, што цыркулявалі ў суседніх і больш далёкіх хрысціянскіх краінах, асаблівасць была не столькі ў іх змесце, колькі ў незвычайнай свабодзе перамяшчэння, пранікнення і, што асабліва важна, пераплеценасці і ўзаемаўплывах. Не толькі «хрысціянскае» побач з «паганьскім», але і «хрысціянскае» ў розных яго адценнях і традыцыях. Наш непаўторны, «свой» тып духоўнасці адгэтуль — з мазаічнасці, багацця і, у пэўнай меры, сумяшчальнасці рэлігійных ідэй і рэлігійнага жыцця ўвогуле.

З нашых разважанняў напрошваецца наступны вывад. Духоўная рэлігійная традыцыя, якая пачала складвацца ўжо ў першыя вякі бытавання хрысціянства ў нашым народзе, з цягам часу выступіла своеасаблівым культурным «сітам», праз якое адбываўся паступовы і старанны адбор рысаў і ідэй візантыйскага рэлігійнага жывапісу, найбольш адпавядаючых растучаму, маладому, дзейснаму

беларускаму этнасу. Народу, што свае найважнейшыя сацыяльныя і нацыянальныя якасці — памяркоўнасць і цярпімасць — усклаў на падмурак духоўнага жыцця, у візантыйскім сакральным жывапісе імпанавала перш за ўсё ягоная высокая адухоўленасць. Менавіта гэтая вызначальная рыса цалкам лягла ў аснову канцэпцыі беларускага нацыянальнага абраза. Але ў духоўным і мастацкім строях абразоў, якія нараджаліся ў рамках светапогляду, не зусім падобнага да візантыйскага, непазбежна з'яўляецца свая асабістая інтэрпрэтацыя, якая з цягам часу і нараджае феномен — «беларускі абраз».

[1] Гл.: Ветер Э. И. // Неман. 1981. № 8.
[2] Пуцко В. Г. // Наш родавод. Гродно, 1991. Кн. 3. Ч. 2. С. 367.
[3] Ёнжа // Наш радавод. Гродна, 1992. Кн. 4. Ч. 1. С. 64.
[4] Попова О. С. // Древнерусское искусство. М., 1977. С. 142 — 143.

М. С. МАМАРАЗАКОВ

## МУСУЛЬМАНСКАЯ ДИАСПОРА В БЕЛАРУСИ: ПРОБЛЕМА КУЛЬТА

Шесть столетий назад в ряде мест на территориях современных Беларуси, Литвы и Польши стали селиться татары. Эта юбилейная дата символизирует начало возникновения татарской диаспоры, т. е. расселения части народа вне страны происхождения. Данный этнос, естественно, принес с собой и свою религию — ислам.

Исследователи прошлого не оставили без внимания этот феномен. Наиболее фундаментальный труд о татарской диаспоре Северо-Западного края был написан в прошлом веке уроженцем Новогрудка, профессором Санкт-Петербургского университета А. Мухлинским[1]. Представляют интерес в этом плане также книга С. В. Думина и И. Б. Канапацкого и брошюра А. Станкевича. По мнению этих и других ученых, предки белорусских и польско-литовских татар — выходцы из Золотой Орды.

В последние десятилетия влияние ислама, как и релегии в целом, на этих территориях было значительно подорвано в результате нередко насильственных секуляризационных процессов и других факторов. Религия современных татар диаспоры сосредоточилась, как правило, в сфере быта и семейных отношений.

Цель настоящей статьи заключается в том, чтобы показать уровень знания и практического соблюдения религиозно-бытовых традиций, обычаев и обрядов у татар на основе социологического исследования, проведенного автором в марте 1993 г. в городах Ивье и Новогрудок Гродненской области[3], а также интервьюирования нескольких лиц татарской национальности в районах Крушниане и Бохоники Белостокской области Польши (май 1992 г.). В ходе исследования подтвердилось наше предположение, что мы будем иметь дело с «бытовым исламом», значительно отличающимся от так называемого канонического. У обследуемых выявлено преобладание обыденного уровня религиозного сознания, в котором идейное содержание несколько размыто, но это компенсировано значимым эмоционально-чувствительным началом. Данный уровень религиозного сознания глубоко связан с семейно-бытовыми традициями, национальными обычаями и непосредственным житейским опытом человека.

Свое исследование мы начали с вопроса о знании респондентами истории происхождения белорусских татар, ибо он неизбежно включал и выход на проблемы религии. Оказалось, что большинство (57 %) респондентов старшего возраста в общих чертах знают историю своего народа, который волею судеб оказался далеко от родной земли. Напротив, молодежь имеет об этом слабые знания. Только 18 % молодых людей (до 30 лет) в той или иной степени знакомы с историей поселения своего народа на белорусской земле. Это накладывает отпечаток и на жизненные ориентации молодежи и на ее отношение к татарским семейно-бытовым традициям и религии. Плохо или вообще не знают семейно-бытовые традиции и обычаи татарского народа 86,3 % молодых людей. Удовлетворительно знают эти проблемы лишь 13,6 % обследованной молодежи. Подлинными носителями национальных семейно-бытовых традиций, обычаев и обрядов являются люди среднего (46 %) и особенно старшего возраста (90 %).

В сознании белорусских татар остались еще следы доисламских верований и обычаев, но в более размытом виде по сравнению с регионами, где мусульмане проживают компактно (напр., Узбекистан). Так, верования и поклонение культам воды и солнца проявляются среди татарского населения Беларуси и Польши